# М. Е. ДАСТАНКА – ПЕРШЫ ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ ТЭЛЕБАЧАННЯ І РАДЫЁВЯШЧАННЯ

**Н. А. Зубчонак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле прадстаўлены асноўныя факты з прафесійнай біяграфіі першага загадчыка кафедры тэлебачання і радыёвяшчання М. Е. Дастанкі.

***Ключавыя словы:*** журналісцкая прафесія; кафедра тэлебачання і радыёвяшчання; прафесійны вопыт; навуковая дзейнасць; Вялікая Айчынная вайна; традыцыі.

# M. E. DOSTANKA – THE FIRST HEAD OF THE DEPARTMENT OF TELEVISION AND RADIO BROADCASTING

**N. A. Zubchonak**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article presents the main facts from the professional biography of the first head of the Department of Television and Radio Broadcasting M. E. Dostanko.

***Key words:*** journalistic profession; the Department of Television and Radio Broadcasting; professional experience; scientific activity; the Great Patriotic War; traditions.

Год гістарычнай памяці яшчэ раз скіроўвае нашу ўвагу на вельмі важныя ў этычным і каштоўнасным плане акалічнасці: гэта неабходнасць шанавання традыцый і вопыту ў агульным сэнсе, а таксама звароту да дзейнасці асоб, чый уклад у развіццё прафесіі і краіны ў цэлым пераацаніць немагчыма. І тут справа нават не ў ацэнках, а ў тым, каб захаваць пераемнасць, глыбока вывучыць і пераасэнсаваць вопыт, каб потым стварыць больш дасканалае.

У працэсе станаўлення журналісцкай прафесіі і ўвогуле грамадскага жыцця БССР у 1950-я–1960-я гг. важным этапам стала адкрыццё рэгулярнага

тэлевяшчання. Наша рэспубліка адной з першых, пасля Украіны, Латвіі і Эстоніі, пачала тэлевяшчанне ў студзені 1956 г. Паступова выпрацоўвалася стратэгія работы, назапашваўся вопыт, з'яўляліся ўласныя праекты. У той жа час кіраўніцтва рэспублікі аб'ектыўна ацэньвала ўзрастаючую ролю тэлебачання ў грамадстве, якое здольна было побач з радыёвяшчаннем інфармацыйна забяспечыць асноўныя ідэалагічныя напрамкі рзвіцця савецкай краіны. Так, 6 мая 1967 г. ЦК КПБ прыняў пастанову «Аб паляпшэнні падрыхтоўкі паліграфістаў і журналістаў у рэспубліцы». Вынікам рэалізацыі гэтага дакумента стала тое, што аддзяленне журналістыкі пры філалагічным факультэце БДУ імя. У. І. Леніна было ператворана ў асобны факультэт, павялічаны план прыёму. Праз некаторы час там была адкрыта кафедра тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання, што дазволіла забяспечваць нацыянальныя сродкі масавай інфармацыі ўласнымі спецыялістамі. Прафесійную падрыхтоўку студэнтаў на факультэце ажыццяўлялі не проста вопытныя выкладчыкі, а асобы з велізарным грамадскім і журналісцкім вопытам.

Мікалай Еўкавіч Дастанка – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, журналіст, навуковец. У яго асабістай справе, што захоўваецца ў архіве БДУ, ёсць заява ад 5 лістапада 1967 г. аб залічэнні на пасаду загадчыка кафедры тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання.

Плённай выкладчыцкай і навуковай дзейнасці папярэднічаў значны прафесійны вопыт. Так, у 1935–1940 гг. М. Е. Дастанка працаваў у Любанскай раённай газеце на пасадзе літсупрацоўніка, адказнага сакратара, намесніка адказнага сакратара; у 1940 г. быў спецыяльным карэспандэнтам Пінскай абласной газеты. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ўступіў у Камуністычную партыю. Са студзеня 1941 г. працаваў загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Целеханскага райкама партыі і рэдактарам мясцовай раённай газеты.

У першыя дні вайны ўзначаліў падпольную партыйна-камсамольскую групу, якая ў тыле ворага арганізавала выпуск вялікай колькасці лістовак. У красавіку 1943 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў зоне злучэння партызанскіх атрадаў у Любанскім раёне пачала выхад газета «Народны мсцівец» – орган Слуцкага падпольнага райкама КП(б)Б. Яе рэдактарам стаў М. Е. Дастанка. Дзякуючы самаадданай працы аўтарскага калектыву, з 1943 па 1944 г. было надрукавана 78 нумароў самой газеты агульным накладам 37 300 экз. Журналісты пісалі пра зверствы фашысцкіх захопнікаў, выкрывалі іх злачынствы супраць мірнага насельніцтва, садзейнічалі арганізацыі сістэмы патрыятычнага падполля, партызанскай барацьбы

ў Беларусі. У адным з першых нумароў былі надрукаваны такія радкі: «Нельга пералічыць зверскія ўчынкі гітлераўскіх крывапіўцаў, нельга пералічыць імёны нашых людзей, якія загінулі ад рукі нямецкіх катаў. Яны, ап'янеўшыя ад народнай крыві, шукаюць новых повадаў, каб знішчыць беларускі народ» (НМ, 11.04.1943 г.).

Акрамя самой газеты, рэдакцыяй было надрукавана больш за 70 000 экз. лістовак і адозваў («Весткі з фронту», «Весткі з Савецкай Радзімы», «Да паліцэйскіх і асоб, што находзяцца на службе ў немцаў», «Да працоўных Слуцкага раёна» і інш.). Сімвалічна, што менавіта на Любаншчыне ў 1943 г. быў арганізаваны выпуск агульнарэспубліканскіх газет «Звязда» і «Чырвоная змена».

За плённую працоўную дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны М. Е. Дастанка быў узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны І ступені, ордэнам «Знак пашаны», медалямі «За працоўную дзейнасць», «Падпольшчыку Айчыннай вайны», «За доблесную працу ў гонар Перамогі ў Айчыннай вайне» і інш.

Пасля вызвалення БССР М. Е. Дастанка працаваў рэдактарам Слуцкай раённай газеты, намеснікам рэдактара Бабруйскай абласной газеты, рэдактарам газеты «Чырвоная змена», уласным карэспандэнтам газеты «Известия», карэспандэнтам Усесаюнага радыё па БССР, рэдактарам «Настаўніцкай газеты».

На пасадзе загадчыка кафедры тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання М. Е. Дастанка знаходзіўся з 1968 па 1975 гг. У 1967 г. у Маскве абараніў дысертацыю «Газета "Звязда"» ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1441 г. – май 1945 г.) на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, у 1969 г. атрымаў званне дацэнта. Нельга не адзначыць, што адзначаная навуковая праца на сённяшні дзень застаецца найбольш поўным даследаваннем дзейнасці газеты «Звязда» за дадзены перыяд.

М. Е. Дастанка з'яўляецца аўтарам першых падручнікаў па беларускай тэлевізійнай журналістыцы: «Многоликий экран» (1974 г.), «Гаворыць і паказвае Беларусь» (1975 г.), а таксама значнай колькасці навуковых і публіцыстычных артыкулаў. Вялікі прафесійны і грамадскі вопыт садзейнічаў эфектыўнай працы на факультэце журналістыкі па падрыхтоўцы кадраў для сродкаў масавай інфармацыі.

Сёння калектыў кафедры тэлебачання і радыёвяшчання паспяхова ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў у адпаведнасці з навейшымі адукацыйнымі стандартамі і тэхналогіямі, а таксама з улікам прафесійнага вопыту, закладзенага яе папярэднікамі.